ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (1033) ● ПАНЯДЗЕЛАК, 10 снежня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



### ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

У кожнай, нават самай малой справе, галоўнае — быць захопленым. Тады любыя цяжкасці табе па плячу, а работа прыносіць асабістае задавальненне і павагу таварышаў.

Іменна такі, на ўсё жыццё ўлюбёны ў матэматыку, Іван Сандрыгайла, студэнт IV курса матэматычнага факультэта. На Усесаюзным аглядзе студэнцкіх навуковых работ яго даследаванне «Аб краявой задачы Гільберта з бясконцым індэксам для паўплоскасці» была ўдастоена медаля.

## У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ

На чарговым пасяджэнні размеркаваны ўчасткі работы паміж членамі парткома:

**В. Б. Будкоў** — работа добраахвотнай народнай дружыны.

**Т. Воднеў** — спартыўна-масавая работа.

**Т. Я. Дударава** — сакратар парткома.

**У. В. Лютаў** — ваенна-патрыятычнае выхаванне.

**С. А. Лысенка** — культурна-масавая работа.

**С. А. Малевіч** — работа кураратараў, лекцыйная прапаганда.

**У. А. Наумовіч** — работа грамадскіх арганізацый.

**В. І. Пракошын** — намеснік сакратара парткома.

**У. М. Сікорскі** — рэктар універсітэта.

**А. Н. Сеўчанка** — навукова-даследчая работа.

**Я. М. Тагуноў**— намеснік сакратара парткома па народнаму кантролю.

**М. Я. Цікоцкі** — друк і падпіска.

**С. А. Умрэйка** — вучэбная работа.

**І. О. Царук** — работа з маладымі камуністамі.

**М. Я. Шкляр** — намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце.

**В. Г. Шлык** — сістэма партыйнай адукацыі.

**В. Ф. Якушка** — студэнцкая навукова-даследчая работа.

## У САВЕЦЕ

### АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Савет універсітэта на сваім пасяджэнні 3 снежня разглядзеў вынікі прыёму студэнтаў у 1973 годзе і задачы універсітэта па забеспячэнню новага набору.

Прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар А. Я. Малышаў, які выступіў з дакладам, усебакова прааналізаваў работу, якая была зроблена па арганізацыі прыёму новага папаўнення. Яна ўключала падрыхтоўку друкаваных матэрыялаў, выступленні выкладчыкаў у рэспубліканскім друку, па радыё і тэлебачанню аб профілю падрыхтоўкі спецыялістаў у БДУ, дні адкрытых дзвярэй, заняткі школ юных фізікаў, хімікаў, біёлагаў, матэматыкаў, вочных і завочных курсаў і г. д.

А. Я. Малышаў прывёў характэрныя лічбы, вынікі аналізу адказаў абітурыентаў, ускрыў шэраг недахопаў.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэкан фізічнага факультэта І. П. Зяцькоў, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання М. Я. Цікоцкі, загадчык кафедры марксісцска-ленінскай філасофіі Г. П. Давыдзюк, дэкан падрыхтоўчага факультэта М. К. Гарбачоў, намеснік дэкана матэматычнага факультэта І. А. Паўлаў. Закрануты былі асаблівасці размеркавання маладых спецыялістаў, пытанні сацыяльнага саставу студэнцкага папаўнення, спецыфіка прыёму на факультэт журналістыкі, праблемы падрыхтоўкі замежных студэнтаў і інш.

Рэктар, прафесар У. М. Сікорскі абагульніў выступленні, адказаў на пытанні, сканцэнтраваў увагу на неадкладных задачах.

Аб павышэнні кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу далажылі савету прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько і дырэктар інстытута павышэння кваліфікацыі дацэнт А. Д. Малочка.

## НОВЫ ІНСТЫТУТ У РЭСПУБЛІЦЫ

З 1 верасня гэтага года пачаў працаваць Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў пры БДУ. На яго ўскладзена павышэнне ідэйна-тэарэтычнага і навукова-метадычнага ўзроўню і педагагічнага майстэрства выкладчыкаў гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі і навуковага камунізму; навучанне слухачоў уменню весці рашучую барацьбу з сучаснай буржуазнай ідэалогіяй, антыкамунізмам і рэвізіянізмам; развіццё навыкаў выкарыстання тэхнічных і іншых сродкаў навучання, найбольш эфектыўных метадаў выкладання грамадскіх дысцыплін.

Арганізатарамі гэтай работы з'яўляюцца створаныя ў ІПК тры кафедры грамадскіх навук: марксісцка-ленінскай філасофіі (загадчык доктар філасофскіх навук, прафесар А. С. Кляўчэня), гісторыі КПСС (заг. доктар гістарычных навук А. М. Малашка), палітычнай эканоміі (заг. кандыдат эканамічных навук, дацэнт Г. Ц. Кавалеўскі).

Па-другое, навуковая распрацоўка методыкі выкладання грамадскіх навук у вышэйшых навучальных установах, абагульненне і распаўсюджанне перадавога вопыту выкладання грамадскіх навук, выкарыстання наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў у навучальным працэсе, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, іх ідэйна-палітычнага выхавання і дзейнасці вучэбна-метадычных кабінетаў. Для рашэння гэтай задачы намечана стварыць навукова-метадычны кабінет. Мяркуецца ў саставе навукова-метадычнага кабінета мець дзве групы супрацоўнікаў: адну па вывучэнню, абагульненню і распаўсюджанню вопыту выкладання грамадскіх навук, другую — па ўкараненню наглядных дапаможнікаў, тэхнічных сродкаў навучання.

Кіраўніцтва інстытута і кафедр, калектыў яго супрацоўнікаў правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да адкрыцця ІПК і арганізавана-га пачатку першага навучальнага года: вывучан вопыт работы Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага, Уральскага ІПК, своечасова распрацаваны, зацверджаны, надрукаваны вучэбныя планы па кафедрах гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі і палітэканоміі; падабраны і праінструктаваны выкладчыкі, падрыхтаваны і аснашчаны неабходным абсталяваннем вучэбныя і адміністрацыйныя памяшканні, інтэрнат для іншагародніх слухачоў, арганізавана іх харчаванне і медыцынскае абслугоўванне.

Для павышэння кваліфікацыі ў першым наборы ІПК залічан 71 слухач. У наступным, лютаўскім наборы ў ІПК будзе прынята першая група выкладчыкаў навуковага камунізму, а колькасць слухачоў вырасце да 100 чалавек.

У нашым ІПК праходзяць перападрыхтоўку прадстаўнікі дзесяці нацыянальнасцей з дзевяці саюзных рэспублік. Павышаць сваю кваліфікацыю прыехалі ў Мінск выкладчыкі з Хабараўска, Бранска, Алма-Аты, Баку, Ерэвана, Сімферопаля, Вільнюса, Рыгі, Таліна і іншых гарадоў Савецкага Саюза.

Для работы ў ІПК запрошаны найбольш вопытныя спецыялісты з вышэйшых навучальных і навуковых устаноў Мінска. Так, напрыклад, у складзе асноўных выкладчыкаў кафедр інстытута — 16 дактароў навук, прафесараў.

У ІПК працуюць акадэмікі Акадэміі навук БССР К. П. Буслаў і Ф. С. Марцінкевіч, члены-карэспандэнты АН БССР І. М. Ігнаценка, У. М. Сікорскі, В. І. Сцяпанаў і іншыя вядучыя грамадазнаўцы рэспублікі. Усяго для работы са слухачамі першага набору ІПК намечана прыцягнуць 85 выкладчыкаў. У іх ліку запрошана для чытання лекцый ў інстытуце група вядучых спецыялістаў у галіне грамадскіх навук з Масквы, Ленінграда і Кіева.

Вучэбны працэс у інстытуце пачаўся арганізавана, лекцыі ўвогуле чытаюцца на належным узроўні і ў асноўным задавальняюць слухачоў.

Разам з тым за мінулы час выявіліся і некаторыя недахопы: ідэйны змест асобных лекцый яшчэ не поўнасцю адпавядае патрабаванням. Некаторыя выкладчыкі ў сваіх першых лекцыях не заўсёды ўлічвалі спецыфіку аўдыторыі і чыталі свае лекцыі без адпаведных гістарыяграфічных спасылак і неабходных метадычных парад выкладчыкам у пастаноўцы і растлумачэнні студэнцкай моладзі тых ці іншых важных пытанняў адпаведнага курса, не заўсёды дакладна і выразна адказвалі на пастаўленыя пытанні.

Кіраўніцтва інстытута і кафедр прымае неабходныя меры па ліквідацыі адзначаных недахопаў. Няўхільнае павышэнне ідэйнага ўзроўню, якасці навучальнага працэсу мы лічым найважнейшай задачай.

**А. МАЛОЧКА,**
**дырэктар ІПК.**

## АКТЫЎ ВУЧЫЦЦА

На юрыдычным факультэце адбыліся чарговыя заняткі прафсаюзнага актыву. Старшыня прафбюро Валерый Кудзін расказаў пра абавязкі кіраўнікоў прафсаюзных груп. Пра парадак уплаты ўзносаў і афармленне дакументацыі расказала ў сваім выступленні намесніка старшыні прафбюро Соф'я Ключук.

Асаблівая ўвага была ўдзелена праоргам першага курса. З імі праведзены асобныя гутаркі.

На занятках размова ішла і аб падпісцы на прафсаюзныя перыядычныя выданні.

Вучоба прафсаюзнага актыву на юрыдычным факультэце добра наладжана, заняткі праходзяць жыва і цікава.

**І. СЦЯПУРА.**

НАШЫ ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ

## СЯБРОЎСТВА МАЦНЕЕ

У канцы лістапада ў Дрэздэне (ГДР) адбылася III канферэнцыя рэктараў вну СССР і ГДР, якія звязаны сяброўскімі дагаворамі аб супрацоўніцтве. У рабоце канферэнцыі прыняў удзел рэктар нашага універсітэта прафесар У. М. Сікорскі.

Былі абмеркаваны пытанні далейшага ўмацавання адзінства тэорыі і практыкі ў працэсе навучання і выхавання ў вну абедзвюх краін. Адбыўся абмен вопытам у пастаноўцы вучэбна - выхаваўчай работы. Падведзены вынікі супрацоўніцтва універсітэтаў і інстытутаў СССР і ГДР за апошнія два гады і намечаны шляхі пашырэння і ўмацавання міжвузаўскіх сувязей.

У дакладах, прадстаўленых Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Міністэрствам вышэйшай адукацыі ГДР, адзначаліся станоўчы вопыт супрацоўніцтва нашага універсітэта і Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера, дасягнутыя поспехі ў праведзенні сумесных даследаванняў вучонымі фізічных факультэтаў, кафедр грамадскіх навук, у абмене прафесарамі і студэнтамі.

Пасля заканчэння канферэнцыі рэктары савецкіх вну наведалі вну-партнёры ў ГДР. У горадзе Іене была ўдакладнена і падпісана праграма супрацоўніцтва паміж Беларускім і Іенскім універсітэтамі на 1974 — 1975 гады. Яна прадугледжвае далейшае пашырэнне супрацоўніцтва ва ўсіх галінах. Вучоныя абодвух універсітэтаў будуць працягваць сумесную распрацоўку шэрагу актуальных праблем у галінах прыродазнаўчых, гуманітарных і грамадскіх навук. Прадугледжан абмен прафесарамі і выкладчыкамі на больш працяглыя тэрміны, да 10 месяцаў, для чытання курсаў лекцый. Пашыраецца абмен студэнтамі для праходжання вытворча - азнаямленчай практыкі. Штогод будуць выязджаць у Іенскі універсітэт чатыры групы студэнтаў БДУ і адпаведна, прыязджаць да нас чатыры групы студэнтаў Іенскага універсітэта.

У абмене будуць удзельнічаць студэнты фізічнага, хімічнага, матэматычнага, гістарычнага і філалагічнага факультэтаў.

# ДУМАЮЧЫ ПРА БУДУЧАЕ

**Якім з'яўляецца сёння студэнт філалагічнага факультэта, якім ён стане заўтра, калі пачне свой самастойны шлях настаўніка-славесніка. Аб гэтым, аб клопатах факультэта расказвае дэкан Аляксей Арсенцьевіч Волк.**

— Лекцыі па літаратуразнаўству і лінгвістыцы на факультэце чытаюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Акрамя лекцый, праводзяцца спецсемінары па вузкіх праблемах філалогіі. Вельмі папулярны сярод студэнтаў семінары заходнеславянскага мовазнаўства. Практычна вывучаць заходнеславянскія мовы студэнты маюць магчымасць толькі ў нас на факультэце. І адчуваеш прафесійны гонар, калі чуеш, як свабодна размаўляюць яны з нашымі гасцямі з Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі.

Мы лічым, што філолаг павінен умець весці самастойны навуковы пошук. Гэтаму садзейнічае работа ў СНТ і летняя практыка лінгвістаў.

У выніку шматлікіх паездак па сельскіх раёнах Беларусі, Смаленскай вобласці студэнты сабралі дыялектны і фальклорны матэрыял для агульнаславянскага лінгвістычнага атласа і дапамагалі ў стварэнні частотнага слоўніка беларускай мовы. Вынікі іх адлюстраваны ў зборніках «Фальклор Брэсцкай вобласці» і «Песні сямі вёсак», у слоўніку мінска-маладзечанскіх гаворак.

Трынаццаць найбольш актыўных удзельнікаў СНТ у мінулым годзе выступілі з навуковымі дакладамі ва універсітэтах Тарту, Ленінграда, Кіева. Некаторыя са студэнцкіх работ былі апублікаваны.

**— Аляксей Арсенцьевіч, што Вы лічыце неабходным для сучаснага студэнта-філолага!**

— Мы лічым, што педагог, выпускнік універсітэта,— гэта не проста настаўнік, а настаўнік-вучоны. Наша задача не толькі даць студэнту веды, але і запаліць яго творчую думку, абудзіць цікавасць да мастацтва, музыкі, каб ён быў у поўным сэнсе слова інтэлігентным чалавекам.

Нямала ўвагі ўдзяляецца грамадска-палітычнай падрыхтоўцы студэнтаў, выхаванню іх ідэйных перакананняў. З гэтай мэтай кожны тыдзень праводзяцца палітінфармацыі, адбываюцца традыцыйныя вечары дружбы славянскіх народаў, сустрэчы з грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі, ветэранамі вайны, студэнтамі з ГДР, Балгарыі, В'етнама, Конга, Бангладэш.

**— Як правіла, усе студэнты-выпускнікі філфака накіроўваюцца ў сельскія школы. Якую культурна-асветную падрыхтоўку атрымліваюць яны за гады вучобы на факультэце!**

— Культурна - асветная падрыхтоўка адбываецца ў час непасрэднай практыкі. Студэнты кожнага курса шэфствуюць над пэўнай сельскай школай, дзе яны выступаюць з дакладамі перад настаўнікамі і вучнямі, арганізуюць літаратурныя вечары, гутаркі аб сучаснай мове, літаратуры, аб гісторыі БДУ. Такая практыка неабходна для студэнтаў-філолагаў таму, што яна прывівае не толькі вопыт работы з дзецьмі, але і дапамагае адчуць сябе ў нейкай меры кіраўніком культурнага жыцця вёскі.

Нашы сённяшнія студэнты — гэта творчая, актыўная моладзь, якая ўпэўнена адчувае сябе і на сесіі, і на навуковай канферэнцыі, і на практыцы, і ў грамадскай рабоце.

**Л. ІСАЧАНКА.**



Лекцыю па рускай літаратуры чацвёртакурснікам беларускага аддзялення чытае дацэнт П. І. Ткачоў.
Фота Д. Чаховіча.



У камітэце камсамола член партбюро І. А. Рабчынская, сакратар камітэта Л. Агароднік і член камітэта А. Гіруцкі распрацоўваюць пытанні, звязаныя з правядзеннем грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў.

Фота Д. Чаховіча.

# ФІЛФАК: БУДНІ ФАКУЛЬТЭЦКІЯ

## *На парозе*

Вясной Антаніна Шаршнёва скончыць філалагічны факультэт і стане ўжо не проста Шаршнёва для выкладчыкаў, Тоня-Тонечка для сяброў, а Антаніна Леанардаўна. Салідна і нязвыкла гучыць гэта для яе.

— А калі ў вёску пашлюць? — пытаюся.

І ў адказ зусім сур'ёзнае:

— Усё роўна, вёска ці горад, абы любімы прадмет і вучні...

Яна так рыхтавалася да вытворчай практыкі! Але ўсё ж першым урокам не зусім задаволена.

— Першы ўрок... Цяпер хоць бы што, а тады разгубілася. Гавару, гавару, і ўсё неяк машынальна, напружана...

Растлумачваю шостаму класу дзеепрыметнік. Не разумеюць — што хочаш рабі. Успамінаю Чукоўскага «Ад двух да пяці», дзе займальна ідзе гаворка пра граматыку. У класе ажыўленне. А, увогуле, нядрэнна зразумелі...

За час практыкі ў яе склалася думка: хлопчыкі адносяцца да літаратуры па-свойму, а дзяўчынкі — па-свойму. Адказы першых больш лаканічныя, сухія, ніякіх лішніх слоў. Дзяўчынкі надаюць сваім адказам нейкае лірычнае адценне. Хаця не толькі дзяўчынкі.

— Ідзе разбор апавядання Тургенева «Бежын луг». Пытаюся ў класа, хто з хлопчыкаў больш палюбіўся? І амаль усе: «Паўлуша! Ён смелы!»

Але тут падымаецца адзін хлопчык: «А я б пасябраваў з Косцем. Ён такі ўражлівы і пяшчотны. У ім ёсць нешта такое, чаго не ўбачыш у іншых...»

Нечаканымі былі для Антаніны ўпершыню пачутая ёю нязгода з астатнімі і гэтае самае «сваё». Радасна і хораша было пасля гэтага ўрока.

А колькі іх яшчэ будзе ў жыцці, розных-розных... Наперадзе шырокі жыццёвы прастор.

**А. ВАЛАВЫ.**

**Старонку падрыхтавала група студэнтаў II курса факультэта журналістыкі.**

## ВЕЧАР ПАЭЗІІ

Цікавая сустрэча прайшла нядаўна на III курсе філфака. У госці да студэнтаў прыйшлі члены літаб'яднання, якое працуе пры рэдакцыі газеты «Вячэрні Мінск». Адкрыў сустрэчу студэнт філфака, член літаб'яднання М. Дзесятнік. Ён расказаў аб творчасці маладых паэтаў, аб іх імкненні да наватарства. Затым госці прачыталі свае новыя вершы. Тэмы іх самыя разнастайныя.

Навеяныя трагічнымі падзеямі ў Чылі, усхвалявана прагучалі вершы з цыкла «Чылійскія фрэскі» У. Цэквавы і верш, прысвечаны С. Альендэ, А. Залётава.

Жыццю і працы студэнтаў філфака на сельгасработах прысвечана паэма, урывак з якой прачытаў М. Дзесятнік.

У заключэнне госці адказалі на пытанні, расказалі аб сабе.

Літаб'яднанне пры рэдакцыі «Вячэрняга Мінска» існуе з 1967 года. У яго ўваходзяць людзі самых розных прафесій. Кансультуе літаб'яднанне член Саюза пісьменнікаў БССР, празаік В. С. Рудаў. Члены літаб'яднання выступаюць на прадпрыемствах, у навучальных установах горада. Зусім нядаўна яны былі гасцямі моладзі горада Рудзенска, выступалі ў Палацы культуры працаўнікоў быту ў Мінску.

**А. АЛЯКСАНДРАЎ.**

## ЗАХАПЛЕННЕ

— Хто будзе спяваць у нашым хоры?— пытае стараста, студэнтка IV курса беларускага аддзялення, Ларыса Раманюк, у групы навенькіх.

— Я, і я, мяне запішыце!— чуецца з усіх бакоў.

Ну, а як жа з часам, якога так не хапае студэнту?

— Аб часе гаварыць не прыходзіцца, калі ты захоплен цікавай справай, — скажуць потым дзяўчаты.

А пакуль: «Цішэй, ідзе рэпетыцыя!»

— Станьце па галасах, — гаворыць кіраўнік хору народнай песні філфака Уладзімір Васільевіч Журовіч.

Ён бярэ ў рукі баян, і паліліся гукі лірычнай песні.

Пакуль на сцэне толькі дзяўчаты. Хлопцы чакаюць сваёй чаргі, ледзь чутна паўтараючы партыю.

— Тут, у гэтым месцы, бярыце дыханне. Працуйце больш уважліва, сачыце за мной.

Баян гучыць мацней, званчэй спявае хор.

Але вось задуменную мелодыю змяняе бойкае:

«Марусенька, мая
даражэнька,
Раскажы мне праўду,
харашэнька».

Словы, як драбінкі, злятаюць з вуснаў.

— Памятайце аб характары песні!— патрабуе Уладзімір Васільевіч.

Гэта яго песня, яго «Марусенька».

Прыязджаючы з творчых камандзіровак, У. В. Журовіч апрацоўвае пачутыя народныя песні і многія з іх уключае ў рэпертуар. Збіраць іх дапамагаюць яму студэнты.

Жаночую групу змяняе мужчынская.

Ларыса Раманюк вызвалілася, і цяпер з ёю можна пагаварыць.

— Песняй нас захапіў Уладзімір Васільевіч. З яго дапамогай мы ўстанавілі сяброўскія сувязі з хорам народнай песні Мінскага трактарнага завода, якім ён таксама кіруе. На сумесных рэпетыцыях калектывы абменьваюцца сваімі знаходкамі, вучацца адзін у аднаго.

— У гэтым годзе да нас у хор прыйшло яшчэ пяцьдзесят чалавек,—працягвае стараста.— Работы з імі многа, але навічкам дапамагаюць нашы актывісты Марыя Флар'яновіч, Мікалай Цялега, Ірына Роўба, Мікалай Прыгодзіч.

Захоплены хорам не толькі студэнты, але і выкладчыкі. І хоць яны не спяваюць у ім, але тым не менш з'яўляюцца яго заўзятымі паклоннікамі.

...Спяваюць хлопцы. Лёгка і свабодна разліваецца песня...

**І. УЛАДЗІМІРАВА, Т. ЖАЛУДКО.**

## КАЛІ ПАДЫЙСЦІ ТВОРЧА

ЦЯПЕР вельмі многа гавораць аб студэнцкіх навуковых таварыствах, заклікаюць удзельнічаць у навуковых гуртках. Аднак, многія студэнты застаюцца глухімі да гэтых заклікаў, «Спіхнуць» хаця б нармальна ўсе залікі, напісаць курсавыя, здаць экзамены! Маўляў, куды нам, «грэшным». Так яны мяркуюць. І часам не разумеюць тых, хто далучаецца да навукі: «У такія гады сушыць мазгі навукамі. Дзівакі!?»

Хто ж яны, гэтыя «дзівакі?» Што яны знаходзяць у навуковай рабоце? На гэтыя пытанні мы і паспрабавалі адказаць у размове з Таняй Чайко. Яна займаецца на пятым курсе філалагічнага факультэта, вядзе навукова-даследчую работу, і вось ужо другі год выбіраецца старшынёй СНТ.

**— Таня, вы ў СНТ ўжо не навічок, маеце салідны для студэнта стаж навукова-даследчай работы. Але пастарайцеся ўспомніць, з чаго ж ўсё пачалося?**

— На другім курсе мы пісалі курсавую работу па рускай літаратуры. Я ўзяла тэму «Трагедакамедыя Пракаповіча «Уладзімір». (Праблема светапогляду). Большасць студэнтаў трымаецца ад гэтага твора далей. Па-першае, старажытнаруская мова, і, наогул, ён вельмі складаны і цяжкі для разумення. Напэўна, я так створана, што мяне прыцягваюць цяжкасці. Да таго ж, другі курс. У гэты час здаецца, што горы можаш зрушыць. Мне было цікава ва ўсім разабрацца. У крытычнай жа літаратуры я сустрэла шмат супярэчлівых меркаванняў. Захацелася паспрачацца з многімі крытыкамі, адстаяць тое, што лічыла праўдзівым. Так была напісана курсавая. Тэма захапляла. Паглыбіўшы і дапоўніўшы курсавую, напісала навуковую работу.

**— Яна была як-небудзь адзначана?**

— Так. Ёй прысуджана другая катэгорыя на рэспубліканскім аглядзе.

**— Па вашаму расказу адчуваецца, што навуковая работа — гэта цікава. Аднак, па-мойму, яна патрабуе шмат часу. Калі ж вы паспявалі вучыцца?**

Прыйшлося, канешне, у нейкай ступені абмежаваць сябе. Але гэта зусім не адыход ад жыцця. Я хадзіла і ў кіно, і ў тэатры. Толькі глядзела не ўсё запар, а тое, што лічыла найбольш цікавым і важным. А час пры жаданні можна знайсці на ўсё. Трэба толькі вельмі захацець.

**— Мне не раз даводзілася чуць меркаванне, што навуковыя работы студэнтаў, асабліва па мастацтву, літаратуры — гэта «скарб, які ніхто не шукае». Што вы можаце сказаць на гэта?**

— Вядома, даследаванні можна раздзяліць на дзве часткі: тыя, якія непасрэдна даюць матэрыяльны вынік, і тыя, якія не нясуць гэтага выніку. Аднак і другая частка вельмі патрэбная і важная для чалавека. Работы па літаратуразнаўству і гісторыі літаратуры вучаць разумець і адчуваць мастацкія творы, не заставацца глухім да тых скарбаў, якія яны ўтрымліваюць. У той жа час яны карысны самім аўтарам, бо выхоўваюць, вучаць думаць.

**— Так, згодзен. Але перш за ўсё я меў на ўвазе навуковыя работы студэнтаў.**

— Сярод іх таксама сустракаецца многа ўпаўне сталых. Да таго ж, каб пісаць цікавыя навуковыя работы, трэба вучыцца, і СНТ вялікі ў гэтым памочнік.

**— А што вам асабіста дала работа ў СНТ?**

— Самае галоўнае: навучылася працаваць з літаратурай, падыходзіць да ўсяго творча. Гэта дапамагае не толькі ў навуковай рабоце, а наогул у вучобе, жыцці.

**— Калі, па-вашаму, належыць пачынаць навуковыя даследаванні?**

— Гэта не фігурнае катанне, калі пасля 6 год пачынаць ужо позна. Як гавораць: вучыцца ніколі... Канешне, чым раней, тым больш паспееш зрабіць. Але галоўнае, адчуць, што не можаш думаць штампамі, не можаш ва ўсім верыць аўтарытэтам. І тады ты сам прыйдзеш у навуку.

**— Што вы можаце параіць уступаючым у СНТ з «вышыні» свайго вопыту?**

— Не баяцца асабістых меркаванняў, не баяцца выступіць супраць аўтарытэтаў. І быць сціплымі.

**— А сціплы зрынальнік аўтарытэтаў — ці не парадокс гэта?**

— У даным выпадку сціпласць азначае—не думаць, што ты ўжо ўсё адкрыў і вырашыў.

Гутарку запісаў **А. ГРЫЦКЕВІЧ.**

Камсамольскае жыццё

# ІДЗЕ ЛЕНІНСКІ ЎРОК

## СУСТРЭЧА З МУЖНАСЦЮ

«І паміраючы, яна спявала камсамольскія, ваенныя песні. Такой і засталася жыць у нашых сэрцах, з усмешкай на бледных вуснах, з песняй, ад якой на вочы таварышаў міжволі наварочваліся слёзы»,— Віктар Ільіч памаўчаў. «Дарэчы, яна была вашай равесніцай, такой жа 18-гадовай дзяўчынкай. І ленінскі дэвіз «вучыцца камунізму» азначаў для яе абараняць Радзіму, змагацца за яе незалежнасць»,— дадаў ён, азіраючы залу, дзе сабраліся студэнты І курса біялагічнага факультэта.

Сёння яны праводзяць у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Ленінскі ўрок. На сустрэчу са студэнтамі прыйшоў Герой Савецкага Саюза, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, былы камандзір І Бабруйскай партызанскай брыгады Віктар Ільіч Лівенцаў.

Віктар Ільіч гаварыў павольна, і за простымі словамі паўставалі хвалюючыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, карціны гераізму савецкага народа.

І ці не паставіў сябе кожны ў гэтыя хвіліны на месца герояў - равеснікаў, ці не задумаўся над тым, як прадаўжае справу бацькоў?

...Я гляджу на задуменныя твары юнакоў і дзяўчат. Так, словы Віктара Ільіча выклікалі на шчырую размову, нарадзілі новыя думкі, прапановы.

— Я лічу, што нам, студэнтам, трэба сур'ёзна працаваць над сабой, імкнуцца да таго, каб дэвіз «вучыцца камунізму» стаў нашым жыццёвым прынцыпам. «Вучыцца камунізму» — гэта жывая справа камсамольцаў, іх актыўны ўдзел у жыцці курса, групы. Толькі тады, калі мы будзем хварэць душою за агульную справу, калі будзе гарэць у нашых сэрцах агеньчык, назва якому — уласная ініцыятыва, толькі тады мы зможам называць сябе сапраўднымі камсамольцамі,— усхвалявана гаворыць Вольга Кураленя.

— Дарэчы, аб актыўным грамадскім жыцці студэнта. Вядома, што цікавасць да мерапрыемстваў вымяраецца не толькі іх сутнасцю, зместам, але і формай. Таму проста неабходна ўводзіць у практыку камсамольскай работы новыя цікавыя формы правядзення вечароў, сходаў, дыспутаў і г. д. Бо іншы раз бывае, што карыснае пачынанне не атрымлівае распаўсюджання толькі з прычыны казённых адносін да яго з боку саміх камсамольцаў,— працягвае Уладзімір Сас.

Не ведаю, ці то сцэны музея, дзе ўсё — святыня, ці то простыя, даходлівыя словы Віктара Ільіча ўзрушылі камсамольцаў, але Ленінскі ўрок выліўся ў жывую, зацікаўленую размову, якая закончылася экскурсіяй па залах музея.

...Засяроджана слухаюць студэнты экскурсавода. Падоўгу затрымліваюцца ля пажаўцелых камсамольскіх білетаў, прабітых варожай куляй, баявых сцягоў, авеяных дымам, полымем і славай, уважліва ўглядаюцца ў твары камсамольцаў - герояў...

Яны прыйшлі на Ленінскі ўрок, яны прыйшлі на сустрэчу з мужнасцю.

**Т. СКІБІЦКАЯ.**

## «ВУЧЫЦЦА, ПРАЦАВАЦЬ, ЗМАГАЦЦА ПА ЛЕНІНУ!»

пад такім дэвізам праходзіў Ленінскі ўрок у студэнтаў III і IV курсаў аддзяленняў філасофіі і палітэканоміі гістарычнага факультэта.

Выступіўшыя Ірына Катавічэнка і Уладзімір Шчур гаварылі аб галоўнай задачы студэнтаў — добра вучыцца.

— Усякую працу ацэньваюць па яе выніках, — гаворыць Святлана Калінкіна.— Праца студэнта — вучоба. На працягу пяці год мы накопліваем веды, каб затым атрымаць вынік гэтай працы. Ці не доўга чакаць? Пяць гадоў тэрмін не малы. Але мы можам і намнога раней прымяніць свае веды. Гэтаму садзейнічае грамадска-палітычная практыка — выступленні студэнтаў з дакладамі, лекцыямі перад рабочымі, калгаснікамі.

Света расказвае аб тым, як праходзіць грамадска - палітычная практыка ў яе групе.

З вялікай цікавасцю слухалі студэнты выступленне Міхаіла Сільвестравіча Гарачуна, члена КПСС з 1924 года, які працаваў у органах чэка пад непасрэдным кіраўніцтвам Ф. Э. Дзяржынскага. Стары камуніст заклікаў камсамольцаў звярнуць асаблівую ўвагу на вучобу.

**В. РЫБІЦКІ.**

## ВЫПРАБАВАННЕ СПРАВАМІ

НА ГЭТАГА дня трэцякурснікі філфака падрыхтавалі фотаплакат. На адным са здымкаў Ленін сярод прадстаўнікоў народаў Усходу — удзельнікаў II Кангрэса Камінтэрна. А побач — здымкі нашых дзён.

На ўрок былі запрошаны выкладчык кафедры гісторыі КПСС, Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі і ўдзельнік X Сусветнага фестывалю студэнт журфака В. Драгавец. Адкрыла ўрок Алена Тылец.

Затым выступіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Д. П. Жмуроўскі. Баец - кулямётчык, ён удзельнічаў у баях на Бранскім напрамку, у бітве на Курскай дузе, у Корсунь - Шаўчэнкаўскай аперацыі. У час правядзення Яска-Кішынёўскай аперацыі ён з групай байцоў на працягу некалькіх сутак пад ураганным агнём ворага ўтрымліваў плацдарм на беразе ракі Прут, забяспечваючы пераправу нашых войск. За гэты подзвіг Д. П. Жмуроўскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У свой час Дзмітрый Пятровіч быў знаём з многімі саратнікамі У. І. Леніна. Аб гэтым ён расказаў удзельнікам Ленінскага ўрока.

Пяцікурснік журфака Васіль Драгавец падзяліўся ўражаннямі аб Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў.

— У дзень ад'езду на пероне Беларускага вакзала сабраліся тысячы маладых масквічоў, каб пажадаць нашай дэлегацыі шчаслівай дарогі. Апошнія поціскі рук і пажаданні на дарогу. Вагоны пачынаюць адлічваць першыя кіламетры на захад, да Берліна. На ўсёй адлегласці ад Масквы да Брэста, на кожнай станцыі цягнік сустракала моладзь. І зноў усмешкі, кветкі, добрыя пажаданні.

Са шчырай дружалюбнасцю, радушнасцю і сардэчнасцю сустракалі пасланцоў нашай моладзі ўсюды. Васіль Драгавец расказвае аб тым, з якой сімпатыяй гаварылі члены дэлегацый іншых краін аб СССР, аб усеагульнай павазе да У. І. Леніна за мяжой, многія з іх з гонарам насілі значкі з сілуэтам Ільіча.

Ад імя камсамольцаў камсорг курса Ірына Пракапенка падзякавала ўсім выступаючым.

— Многа добрых спраў запланавана ў нас у гэтым годзе,— сказала яна.— І мы завяраем, што справы гэтыя не застануцца толькі ў планах.

**А. ЦІКОЦКІ.**

**Матэрыялы падрыхтаваны прэс — цэнтрам камітэта камсамола.**

## З ІМЕМ ЛЕНІНА...

Падрыхтоўка да Ленінскага ўрока на другім курсе рускага аддзялення філфака пачалася даўно. Цяпер ужо можна лічыць, што галоўным вынікам яе стала мноства цікавых пачынанняў, спраў, што адбыліся на курсе і ў камсамольскіх групах. Гэта сустрэчы з вядомымі людзьмі нашай рэспублікі, вечары паэзіі, правядзенне аглядаў-конкурсаў на лепшую акадэмічную групу. Нядаўна, напрыклад, па ініцыятыве Наташы Кожухавай, старасты другой групы, прайшоў камсамольскі сход «Ёсць у рэвалюцыі пачатак, няма ў рэвалюцыі канца». Чыталі вершы, спрачаліся, гаварылі аб героіцы дваццатых гадоў. А затым гутарка перайшла на задачы сённяшніх дзён, на справы сваёй камсамольскай групы.

...У цішыні залы раздаецца крыху прыглушаны, але вельмі знаёмы і дарагі голас Ільіча. Ён вядзе ўдзельнікаў Ленінскага ўрока ў грозны 1918 год, на Красную плошчу, у шарэнгі чырвонаармейцаў, якія перад адпраўкай на фронт слухаюць выступленне Уладзіміра Ільіча.

Працягваецца Ленінскі ўрок. Адна з яго вядучых, Аня Наўроцкая, прадастаўляе слова ветэрану Ленінскага камсамола, выпускніцы філалагічнага факультэта, дацэнту В. В. Казловай. Вольга Васільеўна ўспамінае аб геранчных справах камсамольцаў даваенных гадоў, расказвае аб сваіх аднакурсніках-філолагах, аб барацьбе студэнтаў універсітэта з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў акупіраваным Мінску.

— Я веру, — гаворыць у заключэнне В. В. Казлова, — што вы, маладыя, зможаце пераадолець усе выпрабаванні, якія сустрэнуцца на вашым шляху.

...Міша Цецюнкоў, сакратар курсавога камсамольскага бюро, падводзіць вынікі Ленінскага ўрока. Ён гаворыць, што адна з галоўных спраў студэнта—гэта вучоба. І выканаць яе на выдатна, значыць, стаць удзельнікам агульнай справы народа, які на практыцы ажыццяўляе ідэі Леніна.

**М. ДУБІЦКІ.**

## НЕ - АБЫЯКАВАСЦІ

Ленінскія ўрокі прайшлі ўжо ва ўсіх групах на ўсіх факультэтах. Адны камсамольскія арганізацыі здолелі правесці сапраўды запамінальныя, яркія сустрэчы з прадстаўнікамі старэйшага пакалення, героямі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэранамі працы. Гэтыя сустрэчы прымусілі камсамольцаў задумацца аб тым, як яны жывуць, працуюць, вучацца. Ленінскі ўрок тут сапраўды быў для многіх урокам жыцця.

Але ці ўсюды было менавіта так?

Ленінскі ўрок на другім патоку першага курса хімічнага факультэта. Выступае камсамолец дваццатых гадоў. Ён гаворыць аб гераічных справах сваіх равеснікаў, аб цяжкасцях, якія ім давялося пераадолець, аб сустрэчах з Мікалаем Астроўскім. Госць гаварыў горача, цікава.

Але многія яго не чулі: размаўлялі, чыталі кнігі, канспекты. Ды, наогул, шумна было ў аўдыторыі.

...А потым была размова. Пытаюся:

— Няўжо не цікава было слухаць?

У адказ поціск плячыма.

Дык што, застаецца абвінаваціць першакурснікаў у няўважлівасці і на гэтым скончыць? Давайце разбярэмся. Ленінскі ўрок пачаўся а палове шостай вечара. А ў адной з груп заняткі ў гэты дзень былі з васьмі гадзін раніцы. Паспрабуйце быць уважлівым пасля дзевяці гадзін заняткаў! Далей. Да апошняй хвіліны ніхто не мог сказаць, у якой аўдыторыі будзе праходзіць Ленінскі ўрок: ніяк не маглі знайсці свабоднага памяшкання. Таму не магло быць і размовы аб прыгожым афармленні залы, а, значыць, і ніякай урачыстасці.

Яшчэ адна дэталь: многія камсамольцы даведаліся аб Ленінскім уроку за некалькі хвілін да пачатку. Яны мне гаварылі:

— Ведаеце, мы бачылі па тэлевізару, як праходзяць Ленінскія ўрокі. Гэта сапраўды здорава і запомніцца на ўсё жыццё. І мы ж маглі зрабіць так! Але вось што атрымалася... Можа, было б лепш, каб сабралася адна група і пагаварыла аб тым, што значыць жыць і працаваць па-ленінску? Такая шчырая размова дала б нам намнога больш, чым мерапрыемства, праведзенае дзеля галачкі.

Ленінскі ўрок на першым курсе хімічнага факультэта не атрымаўся. Хто ў гэтым вінават? Самі камсамольцы. Усе: і камсоргі, і радавыя. Нельга абыякава адносіцца да камсамольскіх спраў. І не толькі да камсамольскіх. Абыякавасць губіць самае добрае пачынанне.

**Л. НІКУЛІНА.**





8 снежня ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі адзначаецца Дзень студэнта. Аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы і камітэт камсамола БДУ сардэчна віншуюць балгарскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, з іх нацыянальным святам.

Напярэдадні свята фотакарэспандэнт газеты Д. Чаховіч наведаў нашых сяброў з Балгарыі і зрабіў некалькі фотаздымкаў.

Вы бачыце студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі Лідзію Міцаву, прэзідэнта зямляцтва балгарскіх студэнтаў Хрыста Ніколава і Мікалая Кьвосева ў момант, калі яны абмяркоўваюць праграму святочнага вечара.

Сустрэча з Румянай Яўцімавай, аспіранткай кафедры беларускай літаратуры (на здымку злева) адбылася на факультэце.

У Мінск Румяна прыехала ў 1972 годзе з мэтай добра вывучыць беларускую мову і літаратуру. Зараз яе даследаванні прысвечаны праблеме гераічнага ў сучаснай беларускай прозе.

Пройдзе яшчэ паўтара года, і Румяна вернецца на радзіму ўжо ў якасці выкладчыка.

# КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

**10 снежня**—25 год назад (1948) Генеральная Асамблея ААН прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека.

**12 снежня**—30 год з дня падпісання (1943) Дагавору аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Савецкім Саюзам і Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

**13 снежня**—100 год з дня нараджэння В. Я. Брусава (1873—1924), савецкага паэта.

**16 снежня**—55 год з дня ўстанаўлення (1918) Савецкай улады ў Літве.

55 год з дня заснавання (1918) Камуністычнай партыі Польшчы, папярэдніцы Польскай аб'яднанай рабочай партыі.

**17 снежня**—55 год з дня ўстанаўлення (1918) Савецкай улады ў Латвіі.

**19 снежня** — 1906 — Нарадзіўся Л. І. Брэжнеў, член Палітбюро ЦК КПСС, Генеральны сакратар ЦК КПСС.

**22 снежня**—Дзень энергетыка.

**24 снежня**—175 год з дня нараджэння Адама Міцкевіча (1798—1855), польскага паэта.

**25 снежня**—1917 — Абвяшчэнне Савецкай улады на Украіне.

80 год з дня нараджэння (1893) Я. К. Цікоцкага, беларускага савецкага кампазітара.

**27 снежня**—35 год з дня (1938) Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб устанаўленні звання Героя Сацыялістычнай Працы.

**28 снежня**—70 год з дня нараджэння (1903) М. К. Калатозава, савецкага кінарэжысёра.

**30 снежня**—(1947) — Румынія абвешчана народнай рэспублікай. З 1965 г.— Сацыялістычная Рэспубліка Румынія.

1922—I Усесаюзны з'езд Саветаў прыняў Дэкларацыю і дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

55 год з дня заснавання (1918) Камуністычнай партыі Германіі.



Дзень добры, зімушка-зіма!
Фота **А. Елісеева.**

## АДПАЧЫВАЮЦЬ СТУДЭНТЫ

Кожны месяц больш 60 студэнтаў універсітэта адпачываюць у студэнцкім прафілакторыі, што размясціўся ў маляўнічым кутку непадалёку ад Мінска. У прафілакторыі ёсць усе ўмовы для добрага адпачынку, лячэння, вучобы. Кожны дзень спецыяльны аўтобус прывозіць іх на заняткі і адвозіць назад.

Нядаўна адбыўся чарговы заезд у прафілакторый.

**(І. ДАРОНАЎ).**
**(КАРПУНКТ ПРАФКОМА).**

## ПА ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ

Шчырыя сяброўскія сувязі паміж слухачамі аддзялення журналістыкі Мінскай ВПШ і студэнтамі факультэта журналістыкі нашага універсітэта усталяваліся даўно. Будучыя журналісты нярэдка сустракаюцца, каб разам парадавацца поспехам, пагаварыць аб недахопах.

Вось і нядаўна на «Агеньчык» да студэнтаў-журналістаў прыйшлі слухачы аддзялення журналістыкі ВПШ.

**І. ВІКТАРАЎ.**

СТУДЭНЦКІЯ РЭЦЭНЗІІ

# КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ

Для Галіны Каржанеўскай — маладой беларускай паэтэсы — Радзіма пачынаецца з вёскі, дзе прайшлі залатыя гады яе маленства і юнацтва, адкуль пралеглі першыя сцяжынкі ў трывожна-таямнічы свет узмужнеласці. У гэтым яшчэ раз пераконваемся, калі чытаем першую кнігу вершаў Г. Каржанеўскай «На мове шчасця», якая сёлета выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Аўтар зноў і зноў звяртаецца да роднай зямлі. Бо з яе і бярэ свой пачатак паэтычнае слова, на ёй зарадзіліся запаветныя мары, самыя шчырыя пачуцці....

Як лён, як выспеўшае зерне,
Любілі слова мужыкі.
Звініць, бы хваля, Заазер'е,
Гучаць ласкава Верабкі...
Забыць і ўдалечы не зможаш
Ні родны дол, ні матчын стол.
Жыве далёкае Залюшша,
Як сотні вёсачак і сёл.

Так піша паэтэса, запрашаючы чытача наведаць мілую ёй Случчыну. У вершы не ўбачыш слоў «мілы», «родны», «дарагі», якія ўжо згубілі ад частага ўжывання паэтычнае хараство. Але затое мы знаходзім зусім, здавалася б, звычайныя словы, глыбока лірычныя радкі. Такі верш хвалюе, надоўга западае ў душу. Чытаеш яго, і нібыта на самай справе пераносішся ў родную вёску аўтара.

На ўзлесак, сцішаны і сонны
Праз год, праз пяць —
а ўсё ж вярнуся.
....Стаяць заснежаныя сосны,
Як піраміды Беларусі.

Паэтэсе нельга адмовіць у майстэрстве неяк асабліва прыкмячаць самае, здаецца, звычайнае ў жыцці. Г. Каржанеўская заўважае, як «гудуць вятры чмяліным гулам», як «кастрычнік дагарыць у зыркім вогнішчы лясным», як «месяца лотаць расцвіўшая, зусім па-летняму свежая», як «праменні ў снопік лета звязала»...

Звяртае на сябе ўвагу мова кнігі. Характэрная рыса — удумлівая праца паэтэсы над кожным радком, над кожным новым творам. Таму на суд чытачоў яна выносіць глыбока лірычныя, кранаючыя сэрца вершы, такія, напрыклад, як «Нагледзеўся месяц»...

Кожны, хто пазнаёміўся з першай кнігай Г. Каржанеўскай, з нецярпеннем будзе чакаць новай сустрэчы, сустрэчы з цудоўным светам паэзіі.

Прозвішча студэнткі універсітэта Г. Каржанеўскай параўнальна нядаўна ўзышло на літаратурным небасхіле. Але новую зорку адразу прыкмецілі. Верыцца, што яе вершы будуць ззяць чысцінёй крыніц роднага краю, таму што яны для паэтэсы — крыніца натхнення на ўсё жыццё.

**В. ЗАДАЛЯ,**
**студэнт.**

Каля двух год крочыць па краіне новы комплекс ГПА — комплекс сілы, здароўя, маладосці. Сотні тысяч людзей штодзённа выходзяць на яго старты. Адны — каб праверыць свае сілы, другія — навучыцца майстэрству ў больш вопытных, трэція — даказаць, што яшчэ «ёсць порах у парахаўніцах». Людзі імкнуцца да спорту.

А што атрымліваецца ў нас? Дазволю сабе прывесці незялікую вытрымку з артыкула «З чаго пачаць?» О. Нясюк, студэнткі IV курса біялагічнага факультэта, змешчанага ў газеце «Віта»: «За спорт у нас адказваюць і члены камітэта камсамола, і члены прафбюро, і асобны орган — спортбюро. Пытаемся, чым жа займаліся гэтыя таварышы, куды глядзелі? Чаму яны ў свой час не прыцягнулі студэнтаў старэйшых курсаў, якія, атрымаўшы залік па фізвыхаванню, забываюць аб гым, што яны павінны абараняць спартыўны гонар факультэта?»

# У КОЛЕ ПРАБЛЕМ

### ПРАБЛЕМА № 1. СТАРЭЙШЫЯ КУРСЫ

Ф. Баброў і Г. Костка (V курс, юрыдычны факультэт): «Нас не запрашалі здаваць нормы ГПА. Здавалі б з вялікім задавальненнем. Але ж наша спортбюро маўчыць».

Старшыня спортбюро юрфака Рыгор Кацуба думае больш аб тым, якія звесткі лепш даць на спартыўную кафедру. Ды яшчэ каб яны не адрозніваліся ад тых, што дае адказны выкладчык.

На пасяджэнні камітэта камсамола матэматычнага факультэта адказная за спартыўную работу Наташа Сямёнава была вельмі занепакоена тым, што студэнтаў IV і V курсаў нельга прыцягнуць да ўдзелу ў здачы норм ГПА. Адно спадзяванне на ваенную кафедру. Хлопцы ў час заняткаў здаюць нормы па многіх відах, за выключэннем плавання. А як быць з дзяўчатамі?

На біялагічным факультэце са 126 студэнтаў V курса толькі адзін выканаў нормы ГПА. На факультэце журналістыкі толькі зараз успомнілі, што існуе комплекс ГПА. Пытанні аб ім на мінулым тыдні, праўда, разглядалі на партбюро.

Вынікі, як кажуць, не прымусілі сябе чакаць. У нядзелю на стадыёне «Дынама» праходзіла масавая здача норм ГПА па кросу і кіданню гранаты. На мінулым тыдні больш двухсот студэнтаў і выкладчыкаў журфака арганізавалі паход у Трасцянец, месца, дзе ў гады Айчыннай вайны ў канцлагеры загінулі 201500 савецкіх грамадзян. І хоць надвор'е было не зусім добрае, але для тых, хто па-сапраўднаму сябруе са спортам,— гэта не перашкода. У бліжэйшыя 10 дзён намечана правесці здачу норм ГПА па стральбе і плаванню.

У басейне водна-спартыўнага камбіната студэнты многіх факультэтаў і супрацоўнікі універсітэта здавалі нормы па плаванню.

Спадзяемся, што гэта ажыўленне не згасне. Комплекс ГПА заваюе ва універсітэце прызнанне, стане спадарожнікам усіх.

Думаецца, што трэба вучыцца і ў лепшых калектываў фізкультуры г. Мінска. У інстытуце народнай гаспадаркі, напрыклад, існуе правіла: «Кожны выпускнік — значкіст ГПА». А нядаўна ўнесена дапаўненне: «Значок не дзеля значка». Гэта значыць, што здача норм ГПА павінна праводзіцца не дзеля лічбаў у справаздачы, а дзеля ўмацавання здароўя сённяшніх студэнтаў — будучых спецыялістаў, дзеля авалодання імі тэарэтычнымі ведамі ў галіне фізічнай культуры і спорту. Апошняе — асабліва важна.

Пры падвядзенні вынікаў вытворчай практыкі ўлічваюць работу студэнтаў у якасці інструктара (на грамадскіх пачатках) па фізкультуры.

### ПРАБЛЕМА № 2. ЛІЧБЫ.

Існуе добрая прымаўка: «Лічбы таксама лік любяць». Пацвярджае яе і статыстыка па ГПА. Каб прыкрыць сваю бяздзейнасць, многія нашы фізкультурныя калектывы пайшлі на падман, фабрыкуючы звесткі аб здачы норм ГПА. Вось некалькі фактаў.

Калі верыць табліцы аб ходзе здачы норм комплексу ГПА на матэматычным факультэце, то 111 чалавек могуць ужо хоць сёння атрымаць значкі. На самай справе гэта лічба значна меншая. Толькі каля сарака студэнтаў поўнасцю выканалі патрабаванні комплексу, з іх усяго чатыры — на права атрымання залатога значка.

Звернемся да агульнауніверсітэцкай табліцы здачы норм ГПА, вывешанай на трэцім паверсе галоўнага корпуса. Чорным па беламу там напісана: «Хімічны факультэт. Выканалі нормы ГПА 103 чалавекі, з іх двое на залаты значок». У мінулую суботу на гэтым факультэце адбыўся спартыўны вечар, дзе залатыя значкі былі ўручаны сямі студэнтам. Узнікае пытанне: альбо лічбы браліся з неба, альбо даныя вельмі старыя?

Хочацца яшчэ раз успомніць аб той жа табліцы. У калонцы «Плаванне» і ў апошняй графе «Усяго выканана» столькі памылак, што можна падумаць: іх запаўнялі без усякіх падстаў. Напрыклад, па плаванню нормы на сярэбраны значок выканаў усяго 31 чалавек на ФПМ і 120 — на фізічным. Агульная ж колькасць выканаўшых нормы на сярэбраны значок складае адпаведна 93 і 127. Дзе ж логіка? А можа многія былі вызвалены ад здачы норм па плаванню? Дык аб гэтым трэба было зрабіць агаворку ў заўвагах.

І гэтак з агульнымі вынікамі на кожным факультэце.

Добра афармлены «Сацыялістычныя абавязацельствы калектыву хімічнага факультэта на 1973 год». Я двойчы праглядаў усе пункты, але ні ў адным не было і слова аб ГПА. У плане работы прафсаюзнага бюро гэтага факультэта пытанне аб ГПА аднесена на май 1974 года. Здаецца, каментарыі не патрэбны.

«Пачынаем урок ранішняй гімнастыкі»,— гучыць штодня па радыё, і тысячы людзей выконваюць гімнастычныя практыкаванні.

«На зарадку станавіся!» — раздаецца каманда, і тысячы школьнікаў хуценька ўскокваюць з ложкаў. А роўна ў 11 гадзін 10 мінут спыняюць работу рабочыя, служачыя, вучоныя — пачынаецца вытворчая гімнастыка.

І толькі ва універсітэце гэтаму пытанню не ўдзяляюць належнай увагі. Студэнты-журналісты, напрыклад, валяюцца ў ложках да 10 гадзін. Калі тут рабіць ранішнюю гімнастыку? Студэнты ж іншых факультэтаў, якія займаюцца ў першую змену, растлумачваюць, што няма часу на такое глупства, як зарадка.

А ў табліцах здачы норм ГПА ў кожнага стаіць адзнака «здадзена» ў калонках «Асабістая і грамадская гігіена» і «Фізічная культура і спорт СССР».

На наш погляд, спортклубу і саветам інтэрнатаў трэба наладзіць правядзенне зарадкі ў інтэрнатах. Можна выдзеліць адказных выкладчыкаў, распрацаваць прыкладныя комплексы практыкаванняў. Гэта пойдзе толькі на карысць студэнтам.

Яшчэ адзін аспект.

На ўсіх факультэтах створаны камісіі па прыёму норм ГПА. Але, як правіла, усёй работай займаюцца толькі старшыні спортбюро і іх намеснікі. Пасяджэнні камісій — выпадковая з'ява. Што ўжо тут казаць аб эфектыўнасці і якасці іх работы?

На пасяджэнні камітэта камсамола матфака, прысвечаным справам комплексу ГПА, адзначалася, што не ўдзяляецца належная ўвага нагляднай агітацыі, насценнаму друку. Сапраўды, ад агітацыі залежыць вельмі многае. Добра наладжана гэта справа на фізічным, біялагічным, юрыдычным і іншых факультэтах. Ініцыятыву праявілі географы, якія вывесілі табліцы вынікаў усіх праведзеных спаборніцтваў. Супраць кожнага прозвішча — вынік. Калі ласка, глядзіце, колькі чалавек выканалі нормы, каму і што засталося здаваць.

Вельмі важны ўлік. На факультэце журналістыкі старшыня спортюро Уладзімір Купрыенка ў любы момант можа сказаць, хто, што і калі здаў. Тут заведзен спецыяльны журнал уліку. Штосьці падобнае робіцца на матэматычным і іншых факультэтах.

Студэнты ўсіх факультэтаў маюць магчымасць трэніравацца ў стралковым ціры, павышаць сваё майстэрства. Гэта, напэўна, адзіны від, дзе можна падрыхтавацца да спаборніцтваў. Як правіла, падрыхтоўчых груп па астатніх відах не існуе. У большасці спартыўных секцый нарматывы комплексу ГПА не здаюць. Узнікае пытанне: якім чынам спартсмены заваявалі права на атрыманне залатых значкоў?

Чаму спортклуб не наладзіць кантроль за ходам здачы норм ГПА?

### ВЫВАДЫ

Яны напрошваюцца самі. Прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, спортклуб і спорткафедра універсітэта яшчэ недастаткова займаюцца арганізатарскай і прапагандысцкай работай непасрэдна ў калектывах фізкультуры. Пара біць трывогу: працэнт здаўшых нормы ГПА ў адносінах да ўсіх студэнтаў БДУ — нізкі. Сапраўдную лічбу, я ўпэўнен, ніхто не назаве, бо няма дакладных звестак і належнага кантролю.

Многія камсамольскія і фізкультурныя работнікі, якія павінны быць запявалам ўсіх цікавых спаборніцтваў і спартыўных мерапрыемстваў, самі да гэтага часу не з'яўляюцца значкістамі ГПА. Дарэчы, у некаторых калектывах да падрыхтоўкі і здачы нарматываў адносяцца фармальна. Прыём нарматываў праводзіцца неарганізавана, будзённа, а таму — нецікава, незапамінальна.

Мне давялося прысутнічаць на вечары-спаборніцтвах «А ну-ка, хлопцы, а нука, дзяўчаты!» у педінстытуце імя А. М. Горкага. Там былі і парад, і ўручэнне залатых і сярэбраных значкоў выкладчыкам і студэнтам, якія паспяхова ўзялі рубяжы ГПА.

Такое запамінаецца надоўга і прыцягвае да ГПА новыя сілы, новых удзельнікаў.

Тут выказаны некаторыя думкі, якія ўзніклі пры знаёмстве са справамі ГПА на факультэтах, прыведзены толькі некаторыя прыклады. На гэтым, думаецца, размова не скончыцца.

**У. СКУЛЬБЕДАЎ.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Аб'ём — 1 друк ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус. п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Зак. 1470. АТ 20690.